


### Зарплату зноў не выдалі

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Харчавік» рабочым не выдаюць зарплату з красавіка.

Гл. ст. 2



### Свет вачыма мастака

У Ганцавічах жыве і плённа працуе таленавіты самадзейны мастак Іван Караленка.

Гл. ст. 3



### Дети стоят в очередь за родителями

Кто они – эти женщины, которые смогли хладнокровно выбросить из жизни этот доверчивый, беззащитный комочек?

Гл. ст. 5


# Спадарожнік

грамадска-палітычнае выданне

кошт свабодны

№ 36 (90) Пятніца, 6 верасня 2002 г. Выдаецца з 15 снежня 2000 г.


**Навіны**

## Домашние волки

**27 августа средь бела дня в колхозе «50 лет БССР» Ганцевичского района бродячие собаки насмерть загрызли двух телят, что находились в летнем лагере вблизи деревни Будча.**

Потери молодняка от нашествия четвероногих могли быть несоизмеримо большими, если бы взбесившуюся стаю домашних волков не спугнули люди.

В деревне Будча нет, пожалуй, такого двора, в котором бы не лаяла собака. Отдельные сельчане держат по двое и более псов. Зазорного в этом ничего нет, конечно. Но те же сельчане забывают держать собак на привязи и, что самое главное, кормить их. Предоставленные сами себе собаки превращаются в диких зверей, которые пропитания ради набрасываются на любую живность. Так и произошло в колхозе «50 лет БССР». Вызванная председателем колхоза Иваном Давыдчиком бригада егерей только за одно утро 28 августа отстреляла вблизи летнего лагеря более десятка бродячих собак. А сколько их ещё осталось?..

Константин ЛУГОВОЙ

## Снова горят сараи

**Два пожара случились 27 и 28 августа в деревне Куково Ганцевичского района. Безжалостный огонь уничтожил две надворные постройки у жительницы этой деревни Н.В. Варган.**

В пламени сгорели два велосипеда, бензопила, различный хозяйственный инвентарь.

В три часа ночи вспыхнул дощатый сарай у односельчанина Варган – М.А. Воскалея. Огнём полностью уничтожена кровля дощатого строения. Если бы не своевременное вмешательство пожарных, ущерб хозяйству был бы нанесён несоизмеримо больший.

В обоих случаях причины пожаров устанавливаются. Во втором пожаре не исключён умышленный поджог на почве неприязненных отношений.

Валерий ЛЕОНИДОВ

# Стоят хлеба не кошены



• Урожай с этого поля не увезли бы и десяток грузовиков ...

На прошлой неделе на землях колхоза «Правда», отрапортовавшего еще 2 августа о завершении уборки зерновых, было обнаружено целое поле (20-23 га) неубранного овса. Эта удивительная находка была сделана самими колхозниками недалеко от деревни Будча в урочище «Колодяной мох». Люди, позвонившие в редакцию, были возмущены до глубины души: «*Как же так?* – недоумевали они. – *Мы тут за каждый колосок сражаемся, каждому зернышку кланяемся, а колхозное начальство, прекрасно зная о том, что такие огромные посевы зерновых еще не убраны, никак на это не реагирует*». Как подсчитали сами колхозники, с найденного поля можно было собрать прекрасный урожай – не менее 70 тонн. Можно было… Однако половина зерна, да и какого зерна – размером почти с пшеницу – уже высыпалась.

Особенно возмутительно этот факт смотрится на фоне помпезной телеграммы, направленной администрацией колхоза председателю райисполкома Владимиру Столяру и опубликованной 3 августа на первой странице местной районки.

*(Продолжение на стр. 2)*



## «Есть контакт!»

Если у вас имеется «горячая» информация, интересные новости, вопросы и предложения, если вы хотите высказать свои претензии и дать полезный совет, звоните нам.

В понедельник, 9 сентября, с 16.00 до 18.00 на ваши звонки отвечает

**Петр ГУЗАЕВСКИЙ**

**Наш контактный телефон: 2-14-50**



Промышленность

# Зарплату так и не выдали...

**Второго сентября состоялось собрание ОАО «Пищевик», на котором присутствовали акционеры, администрация, рабочие предприятия и представители райисполкома.**

Вопросы обсуждались всё те же: как выжить предприятию, о выплате заработной платы и задолженности перед государством, кредиторами.

Как один из способов выхода из кризиса, обсуждался вопрос о переводе части акций предприятия в счёт долгов фирме «Белресурсы». В данном случае, по словам одного из представителей этой структуры, не исключена возможность новых капиталовложений и улучшения финансово-экономического состояния ОАО «Пищевик».

Однако окончательного решения так и не было принято.

А тем временем на сегодняшний день часть задолженности по зарплате руководство «Пищевика» пытается погасить натуроплатой: товарами со склада и свиньями, которые выращивают в подсобном хозяйстве.

Своё обещание выплатить зарплату до 25 августа и.о. директора Николай Бритвин сдержать, к сожалению, не смог. Причиной тому не поступившие вовремя обещанные 50 млн. рублей предоплаты за продукты.

Петр ГУЗАЕВСКИЙ



• Кто поможет комбинату?

# Стоят хлеба не кошены

*(Окончание. Нач. на стр.1)*

Помимо всего прочего, есть в этой телеграмме и такие строки: «Праўленне калгаса "Праўда" паведамляе, што, выконваючы Даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі, якія былі выкладзены на селектарнай нарадзе па пытаннях жніва, а таксама рэкамендацыі раённага выканаўчага камітэта, па стану на 2 жніўня 2002 года ў гаспадарцы закончана ўборка зерневых культур на 650-гектарнай плошчы пры сярэдняй ураджайнасці 28,1 цэнтнера". *"Выказваем шчырую падзяку кіраўніцтву краіны, абласкаму, мясцовай уладзе за аказаную нам дапамогу..." "Наша праца – гэта канкрэтны адказ на падтрымку вёскі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь".* Вот так "адказалі", вот так "падзякавалі"...

Естественно, мы обратились в колхоз за комментариями. Однако ничего вразумительного так и не услышали. Заместитель председателя колхоза Дмитрий Ленковец, исполняющий на данный момент функции главы хозяйства вместо находящегося на излечении в райбольнице Михаила Кононовича, о засеянном овсом поле ничего, по его словам, не знал. Примерно такой же ответ услышали мы и от заместителя председателя райисполкома, начальника райсельхозпрода Викентия Монтика. Правда, в отличие от своего коллеги, обещал все разузнать и проинформировать корреспондентов «Спадарожніка». Однако в результате ситуация не разъяснилась, а, скорее, запуталась еще больше. Сначала господин Монтик попытался уверить корреспондентов, что овес, растущий на правдинских полях, принадлежит не колхозу, а какой-то городской организации, название которой он так и не вспомнил, а потом и вовсе договорился до того, что овес оставили на полях специально для того, чтобы зимой не пропали без корма дикие кабаны и прочая лесная живность.

После таких, с позволения сказать, комментариев, остается уповать лишь на одно: расследованием всех этих фактов в самое ближайшее время займутся куда более компетентные органы.

Константин МОХАР

Ахова прыроды

# У лес – па грыбы

**Вось і настала тая пара, калі з'явіліся першыя грыбы ў гэтым годзе. Самыя заядлыя аматары ціхага палявання адразу накіраваліся ў лясы. Аднак насцярожвае тое, што з кожным годам грыбоў становіцца ўсё менш і менш. І прычынай таму служыць не толькі вынішчэнне лясоў, але і тое, што не ўсе ведаюць, як трэба збіраць грыбы.**

Нават вучоныя да нашых дзён спрачаюцца, бо так і не вырашылі, што ж лепей: рваць грыбы з карэннем ці зрэзваць нажом? Большасць з міколагаў (грыбы вывучае навука мікалогія) даказваюць, што грыбы трэба выкручваць з зямлі, у адваротным выпадку зрэзаны пянёк загніе і загубіць грыбніцу. А некаторыя з іх лічаць, што грыбы трэба акуратна зрэзваць, каб не пашкодзіць грыбніцу.

Аднак яны аднагалосна прыйшлі да высновы, што болей за ўсё грыбніца баіцца знішчэння асяроддзя яе аховы. Гэта значыць, што калі вы будзеце падымаць мох, зрэзваць падсцілку – грыбніца згіне.

Найбольш каштоўнымі па смакавых і каларыйных якасцях лічацца грыбы першага гатунку: белы грыб (сасновы, ялавы, бярозавы), у народзе які называюць баравіком, груздзь сапраўдны, груздзь жоўты, рыжык (яловы, сасновы). У хатніх умовах з іх можна прыгатаваць самыя разнастайныя стравы. А таксама грыбы можна саліць, марынаваць, сушыць, а лішкі можна прадаць.

Мы пацікавіліся і даведаліся, што рэалізаваць грыбы можна ў нарыхтоўчых магазінах раёна. Сухія белыя грыбы першага гатунку ў вас возьмуць па цане 15 тысяч рублёў за кілаграм. Грыбы – жаўцякі другога гатунку – па 8 тысяч рублёў за кілаграм. Перад здачай грыбы павінны прайсці кантроль на радыёлагічнай станцыі па вуліцы Рэвалюцыйнай, у г. Ганцавічы.

А калі ёсць жаданне паспрабаваць свае сілі ў ролі прадаўца, грыбы можна прадаць на рынку. Аднак для гэтага неабходна прайсці экспертызу ў лабараторыі, якая знаходзіцца на базары, на ўтрыманне шкодных рэчываў, вядома ж, не задарма і заплаціць за месца.

Аляксандр КЛЕЎЖЫЦ, навучэнец ліцэя

Наша почта

# Инициатива наказуема...

Всем известно, что бюджетные средства, отпускаемые на ремонт школ, очень скудны. Поэтому в конце учебного года директор СШ №1 г. Ганцевичи Александр Иванович Лыгановский на общешкольном родительском собрании обратился к родителям с просьбой оказать содействие (материальную помощь, личное участие) в проведении ремонта классных помещений. В кабинете №16, где занимаются мои дети, ремонта не было 11 лет, и родители откликнулись на просьбу директора: собрали деньги, организовали доставку в школу всех необходимых для ремонта строительных материалов.

Вместо благодарности за помощь родители в ответ получили хамство. Они были выставлены из класса заместителем директора по хозяйственной части Михаилом Макадеба. Кроме этого, в адрес родителей были высказаны претензии в грубой форме, что помогают они только словами, а не делом, и что вообще ремонт класса — обязанность классного руководителя и родителей (!).

Получается, что родители, по словам Макадебы, оказались виноваты в том, что не закончили за лето ремонт в классе и обременяют его, Макадебу, какими-то просьбами: сделать крепления для карнизов, заштукатурить неровности на стенах перед оклейкой обоями.

Виноватыми оказались те, кто что-то делал, а правым тот, кто бездельничал. Подумайте, не абсурд ли это?

Тамара ЛОГВИНОВИЧ

V-ая чвэрць

# Отработали практику и заработали денег

**Около 300 учащихся девяти средних школ района и Ганцевичского профессионального лицея сельхозпроизводства отработали практику в составе строительных бригад и при этом получат свои заработанные деньги.**

Уже третий год из республиканского Фонда содействия занятости населения для учебных заведений выделяются средства. В этом году на ремонт школ и оплату работ было выделено 30 миллионов рублей. В прошлом и позапрошлом эта сумма составила 10 миллионов и 1 миллион рублей.

Из выделенной суммы 50% тратится на стройматериалы и инвентарь, а другая половина на оплату труда учащихся.

Строительные бригады формировались из ребят, которые достигли 14-летнего возраста и только с разрешения родителей. Также необходимо было пройти медицинскую комиссию.

Такая поддержка центром занятости является для школ существенным подспорьем, ведь на ремонт всегда денег не хватает. Да и дети работают с большим энтузиазмом, зная, что их труд оплачивается. Кроме того, практические навыки, полученные в ходе ремонта, как считают ребята, всегда пригодятся им в жизни.

Павел БОГУШ

**Цены на продукты на рынках** (в руб.)

| | Барановичи | Ганцевичи | Ляховичи |
|---|---|---|---|
| Сало | 3200-4000 | 3200 | 3800 |
| Окорочка | 3200 | 3200 | 3300 |
| Масло раст. | 1650 -2100 | 1650-2000 | 1800-2450 |
| Горох | 348-600 | 400 | 470 |
| Лук | 500 | 500 | 900 |
| Шпроты | 700-900 | 600-650 | 800 |
| Апельсины | 1800 | 1700 | 1800 |
| Бананы | 1700 | 1500 | 1300 |
| Лимоны | 1800 | 1800 | 2200 |
| Помидоры | 700 | 450-600 | 500-600 |
| Гречка | 650 | 550 | 640 |
| Пшено | 500 | 550 | 650 |
| Сахар | 820 | 790 | 720 |
| Мука в/с | 500 | 440 | 600 |
| Рис | 750-1000 | 650 | 750 |
| Арбузы | 500 | 450 | 500 |
| Дыня | 1500 | 1500 | 1500 |
| Персики | 2500 | 2200-2400 | 3500 |



## Горожане отвечают

**Довольны ли вы уровнем медицинского обслуживания в нашем районе?**



**Анатоль Трафімчык, літаратар:**

– Я не часта звяртаюся да дактароў, і тыя паслугі, за якімі мне давялося звяртацца, мяне задавальнялі. Вось толькі хочацца, каб узровень абслугоўвання ў вёсках быў вышэйшы, бо захоўваецца вялікая розніца паміж горадам і вёскай.



**Вера, работает в пиццерии г. Минска:**

– Да, на данный момент я довольна. Все хорошо. Как раз сегодня я была на приёме, и ко мне очень внимательно отнеслись.



**Александр Демьянович Винник, работник кинотеатра:**

– У нас ФАП в д. Борки открыли, а что толку – медикаментов там практически никогда нет. Приходится в Ганцевичи ездить, чтобы купить. В деревне в основном пенсионеры живут, для многих огромный труд в город добраться...



**Леонид Дыдышко, врач РТМО:**

– При таком финансировании медицины ожидать хорошего уровня медицинского обслуживания довольно проблематично.



**Любовь Александровна Крупенич, работает в СШ № 3:**

– Да, довольна. Я часто обращаюсь в больницу и благодарна врачам Дубровному и Сашко. Они всегда очень внимательны и идут навстречу людям.



**Саша, учащийся:**

– В какой-то степени я доволен. Но хотелось бы, чтобы в нашей больнице появлялись новые молодые специалисты и новое оборудование.



**Галина Щурко, сторож в ГДК:**

– Мы почти не пользуемся услугами больницы, стараемся вести здоровый образ жизни и меньше болеть.

Опрос провела Екатерина АНИСИМОВА

Знакамітыя людзі Ганцаўшчыны

# Свет вачыма мастака і грамадзяніна

Напэўна, мала хто ведае, што наш зямляк – Іван Іванавіч Караленка, які жыве і працуе ў Ганцавічах, адзіны мастак на прасторы былога СНД, які падрыхтаваў выставу твораў, прысвечаную другой гадавіне з дня гібелі атамнай падводнай лодкі "Курск". Выстава пачала працаваць у Пінску 28 ліпеня ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы.

Мастаку спатрэбіўся толькі адзін месяц, каб падрыхтаваць яе. Мабыць, таму, што тэма гэтая блізкая Івану Караленку: ён сам служыў на АПЛ 9 гадоў і быў капітанам III рангу.

*– Гэта выхodзіла з майго сэрца,* – кажа Іван Іванавіч. *– Я павінен быў аддаць даніну павагі загінуўшым падводнікам. Менавіта гэта і падштурхнула мяне ўзяцца за пэндзлі.*

Выстава прадстаўлена 10-цю палотнамі ваеннамарской тэматыкі, большасць з якіх складаюць малюнкі падводнай лодкі "Курск", а таксама партрэты загінуўшага капітана II ранга, старшага памочніка камандзіра АПЛ "Курск" Сяргея Дудко, ураджэнца г. Пінска.

Зацікавіліся выставай і паказвалі творы нашага мастака расійскія тэлеканалы ГРТ і РТР. Сюжэты таксама здымалі мясцовы пінскі тэлеканал "Варяг" і Брэсцкая студыя тэлебачання.

Другая выстава Івана Караленкі зараз адкрыта ў Брэсце ў абласным грамадска-культурным цэнтры па вуліцы Камуністычнай, 1. Там выстаўлены 30 работ мастака самых разнастайных жанраў: пейзажы, нацюрморты, партрэты.

Творчасць Івана Караленкі прадстаўлена не толькі ў Беларусі, але і на прасторах СНД. Так, яго работы дэманстраваліся на Саюзнай выставе ў Маскве да 70-годдзя Узброеных Сіл, персанальныя былі прадстаўлены ў 1998 ва Уладзівастоку, некалькі карцін мастака пастаянна экспануюцца ў Прыморскай карціннай галерэі.

Свае творы мастак выстаўляў у Мінску, Брэсце, Баранавічах, Ляхавічах. Карціны Івана Караленкі ёсць і ў прыватных калекцыянераў з розных краін свету: у Японіі, ЗША, Германіі.

У бліжэйшай перспектыве Іван Караленка паставіў перад сабой мэту стаць сябрам Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь і цяпер працуе над новымі мастацкімі палотнамі.

Жаданне працаваць у яго вялікае, але вельмі дарагія фарбы, палатно. Мастак робіць усё за свае грошы, закупляе матэрыял, арганізуе выставы.

На жаль, раённы аддзел культуры мастаку не дапамагае. Пэўна, яго творчасць нікому не патрэбна, бо і на камандзіровачныя для мастака ў аддзела не хапае грошай. А вось арганізоўваць перыядычна яго выставы ў раённай бібліятэцы да розных свят прасіць не забываe.

Мастак не прамінуў у гутарцы са мной згадаць, што ў суседнім Ляхавіцкім раёне яго калегу мастаку Анатолю Маісеенку аддзел культуры ўсяляк дапамагае. Відаць, па-рознаму ў розных месцах шануюць народныя таленты...



Фота аўтара

•Іван Караленка ўвесь час у творчым пошуку

Нарадзіўся Іван Караленка ў 1963 годзе ў пасёлку Слабада Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. З 5-га класа займеў мару стаць мастаком і сур'ёзна заняўся жывапісам. Аднак прафесійным мастаком Іван стаў не адразу. У 1980 годзе скончыў сярэднюю школу і стаў курсантам Вышэйшага ваенна-марскога вучылішча ў г. Баку. З 1985 па 1993 год Караленка служыў на Далёкім Усходзе на атамнай падводнай лодцы. Аднак пра сваю дзіцячую мару не забыўся і ў 1987 годзе завочна паступіў у Маскоўскі народны універсітэт мастацтваў на факультэт жывапісу, які паспяхова скончыў у 1991 г.

У 1993 г. Іван Караленка звольніўся ў запас і ў тым жа годзе прыехаў на Ганцаўшчыну. Сапраўдны талент мастака заўважыў тагачасны старшыня гарвыканкама Васіль Прадун. Менавіта дзякуючы яго дапамозе мастаку выдзелілі маленькі пакойчык у гарадской гасцініцы, у якім Караленка працуе і зараз. Іван Караленка з сям'ёй жыве ў Ганцавічах і мае дзвюх дачок – Кацярыну і Ксенію. Жонка працуе намеснікам дырэктара гімназіі па выхаваўчай рабоце.

Другі год у той жа гімназіі Іван Караленка рыхтуе маладыя таленты, кіруе студыяй выяўленчага мастацтва. Будзем спадзявацца, пад кіраўніцтвам мастака з'явяцца новыя таленты на Ганцаўшчыне.

Пятро ГУЗАЕЎСКІ

## У наших соседей У наших соседей У наших соседей

Дробны бізнес

# Баранавіцкія прадпрымальнікі забастоўку праігнаравалі

**У знак пратэсту супраць павышэння падаткаў і арэнднай платы Свабодным прафсаюзам прадпрымальнікаў горада Баранавічы на 1 верасня была абвешчана аднадзённая папераджальная забастоўка. Аднак пераважная большасць прадстаўнікоў дробнага бізнесу сённяшнюю акцыю пратэсту праігнаравала.**



Фота Яўгенії Янукевіч

• Падумалі ды плюнулі

Пытанне пра абвяшчэнне забастоўкі абмяркоўвалася яшчэ загадзя, але, не прыйшоўшы да згоды, прадстаўнікі дробнага бізнесу змаглі ўтварыць толькі забастовачны камітэт з актывістаў Свабоднага прафсаюза прадпрымальнікаў. Менавіта гэты камітэт і прыняў рашэнне правесці 1 верасня аднадзённую папераджальную забастоўку, а ў выпадку, калі яна не дасць ніякага выніку, з наступнага месяца не плаціць падаткі і баставаць бестэрмінова. Паводле слоў старшыні Свабоднага прафсаюза прадпрымальнікаў горада Баранавічы Генадзя Саханчука, гарадскі забастовачны камітэт адмежаваўся ад агульнарэспубліканскай забастоўкі і не выстаўляе ніякіх палітычных патрабаванняў, а толькі эканамічныя. Асноўныя з іх – гэта зніжэнне падаткаў, а таксама змяншэнне арэнднай платы за гандлёвае месца.

Аднак, як паказаў час, далёка не ўсе прадстаўнікі дробнага бізнесу думаюць так, як іх камітэт. У нядзелю пераважная большасць гандляроў выйшла на кірмашы горада, пуставала не больш як дзесятая частка гандлёвых месцаў. На пытанне да некаторых прадпрымальнікаў, чаму яны асабіста не падтрымалі забастоўку, адказы гучалі розныя. Хтосьці казаў аб тым, што не верыць у поспех такіх акцый; нехта наракаў на дрэнную працу прадпрымальніцкага прафсаюза, які не змог своечасова давесці да ўсіх адпаведную інфармацыю. Большасць апытаных давалі адказ аднолькавы: усе выйшлі на працу, а я – як усе. Толькі адзін прадпрымальнік сказаў, што не захацеў губляць грошы, бо сённяшні дзень сапраўды абяцае быць прыбытковым.

Алесь Горбач

Адукацыя

# Половина школ Ляховщины не готовы к приему учеников

**На прошлой неделе специалисты Ляховичского районного центра гигиены и эпидемиологии (ЦгиЭ) подвели итоги проверки готовности учреждений образования к новому учебному году.**

Из 25 учреждений (19 средних школ, 5 школ-садов и 1 начальной школы) лишь 14 школ можно назвать относительно отвечающими санитарным правилам и нормам.

По словам врача-гигиениста ЦГиЭ Валентина Скорины, в прошлом году проводилась аттестация школ района на соответствие санитарным правилам и нормам, и ни одна из школ не была признана аттестованной, 14 школ были аттестованы условно, а остальные не аттестованы вообще. В этом году все осталось по-прежнему: никакой работы по улучшению условий обучения и воспитания не проводилось, так как все силы и средства были направлены на придание зданиям и помещениям соответствующего внешнего вида, т.е. на косметический ремонт. Поэтому специалистами ЦгиЭ выявлено много недостатков в состоянии территорий, пищеблоков, санузлов.

Например, хозяйственные зоны гимназии, Даревской, Липской, Святицкой школ были неухоженными: заросли травой, валялось много мусора, были сломаны скамейки.

В столовой СШ№2 необходим ремонт перекрытий, плохо работает вентиляция помещений, нет условий для соблюдения правил мойки и хранения кухонной посуды. В Кривошинской СШ не работает отвод сточных вод, необходима замена труб, во всех школах, имеющих овощехранилища, эти помещения не готовы к закладке овощей, так как они плохо проветриваются и освещаются.

Самым «больным местом» всех школ являются санузлы. В 14 школах из 25 санузлы находятся внутри помещений, и только в 3-х из них они находятся в более-менее нормальном состоянии. В 11 школах в туалетах не работают или демонтированы унитазы и сливные бачки, умывальники, отмечается высокая влажность и сырость, работают не все питьевые фонтанчики. Туалеты, расположенные на улице, требуют ремонта, как, например, в Тальминовичской СШ.

Также в Куршиновичах и Святице не отремонтированы насосные станции, поэтому территории школ периодически загрязняются сточными водами.

Освещение учебных помещений также оставляет желать лучшего. Во всех школах, кроме пристройки СШ№1 и гимназии, расчетное искусственное освещение в 2 раза ниже нормы, около 40% люминисцентных ламп не работают, в СШ№2 и гимназии при работе светильников генерируется значительный шум, превышающий нормы допустимого в 4 раза.

Все спортивные залы не отвечают «Правилам безопасности занятий по физической культуре» и соответствующим санитарным правилам: уровни естественного и искусственного освещения значительно ниже нормы ( за исключением СШ№1 и СШ д. М. Городище), во многих спортзалах применяются светильники с искаженной цветностью, нет или же не работают системы вентиляции, туалеты, душевые и умывальники не работают или ликвидированы, ни одна из раздевалок не имеет шкафов для одежды учащихся.

Ирина МУХАРЕВСКАЯ

# Фінансаванне школ змянілася


• Першы раз у першы клас

У панядзелак у сярэдніх, спецыяльных і вышэйшых навучальных установах краіны — першы дзень новага навучальнага года. У сістэме сярэдняй адукацыі ён стаў адметным новымі рэформамі і скарачэннем фінансавання школ.

Школьны званок упершыню прагучаў для 95 тысяч першакласнікаў, што на 52 тысячы менш, чым у мінулым годзе. А ўсяго за парты селі 1 мільён 200 тысяч школьнікаў, і гэта на 400 тысяч менш, чым тры гады таму.

Акрамя змяншэння колькасці вучняў, асаблівасцю гэтага года стаў пяцідзённы навучальны тыдзень і ўвядзенне 10-бальнай сістэмы адзнакі ведаў.

Дырэктар мінскай школы №2 Аляксандр Сядзяка ў асноўным станоўча ацэньвае рэформу школы, але сцвярджае, што яна не дастаткова прадуманая.

*"Гэта крок наперад у параўнанні з савецкай сістэмай. Разгрузка навучальных планаў і новы дзень для адпачынку — гэта станоўчы крок. Але тут яшчэ многае трэба прадумаць, таму што субота — гэта дзень не абавязковы для заняткаў, і вучняў зацягнуць у школу будзе вельмі складана. Проста яны будуць заставацца на вуліцы"*, – гаворыць Аляксандр Сядзяка.

*«Ад гэтага навучальнага года ў Беларусі працуюць 4602 школы, і калі для іх новаўводзіны яшчэ і прыдатныя, дык школьная рэформа зусім не адпавядае статусу гімназій і ліцэяў»* — гаворыць дырэктар Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа Уладзімір Колас. А галоўнай адметнасцю гэтага навучальнага года ён называе фінансавыя праблемы: *"Я не назваў бы гэта сапраўднай рэформай, бо рэформа павінна тычыцца сутнасці, а не фармальных перамен. У нас, да прыкладу, з памяншэннем нагрузкі скасоўваецца другая замежная мова і ўвесь ліцэйскі кампанент. А гэты навучальны год — год, адметны якраз адмоўнымі асаблівасцямі — рэзкім скарачэннем фінансавання. У нас няма сродкаў на рамонт, абсталяванне, набыццё навучальнай літаратуры, і нават тэлефоны ў нас адключаны"*, — гаворыць Уладзімір Колас.

Настаўніца з 20-гадовым стажам Людміла Дзіцэвіч сярод магчымых хібаў школьнага рэфармавання называе маральную неабароненасць вучняў і сацыяльную — настаўнікаў: *"Я асцерагаюся бяздумнага выканання. Да прыкладу, пра "дзесятку" кажуць, што гэта такая адзнака, якую рэдка паставіць. Негатыўным можа быць і тое, што класы і школы зачыняюцца, скарачаюцца працоўныя месцы, і настаўнікам у суседнія школы трэба ездзіць. Гэта зноў тыя ровары... Я ўзгадваю, як мой бацька, які працаваў у суседняй школе ў вёсцы, ездзіў на ровары — гэта быў асноўны транспарт настаўнікаў. І так атрымліваецца, што ў XXI стагоддзі мы зноў садзімся на ровары"*.

Галіна АБАКУНЧЫК, беларуская служба Радые Свабода



• Накіпела

## Страйк працягваецца

У панядзелак аб'яднаная рада прадпрымальнікаў заклікала дробных бізнесоўцаў працягваць распачаты ў нядзелю пратэст. Як паведаміў нашаму радыё прадстаўнік рады Анатоль Шумчанка, пазіцыя рады цалкам ухваляецца прадпрымальніцкімі масамі. У Мінску, напрыклад, як і напярэдадні, у панядзелак не працавалі выставы-кірмашы.

Падсумоўваючы вынікі першага дня акцыі, яе арганізатары лічаць пачатак удалым. Вось што спадар Шумчанка зазначыў на гэты конт нашаму Радыё: *"Страйк быў удалым. Ніколі яшчэ ў Беларусі страйк не праводзіўся ў нядзелю, калі прадпрымальнікі атрымліваюць найбольшыя даходы. Таму гэта можна лічыць перамогаю, бо прадпрымальнікі свядома пайшлі на выдаткі, каб дасягнуць мэты.*

*Вельмі актыўна страйкавалі рэгіёны. У акцыі бралі ўдзел бізнесоўцы Гомеля, Магілева, Мазыра, Рэчыцы ды іншых раёнаў. Мне сёння тэлефанавалі прадпрымальнікі, якія гандлююць на кірмашах Мінска, выставах, і казалі пра жаданне далучыцца да страйку".*

Паводле ягоных звестак, страйк можа пашырыцца і за кошт рэгіёнаў, бо не ўсе бізнесоўцы былі праінфармаваны пра пачатак акцыі 1 верасня. Аб'яднаная рада лічыць, што ў рэгіёнах значная частка прадпрымальнікаў была ўведзена ў зман Беларускім страйкавым камітэтам. Страйкам абвясціў іншы сцэнар пратэсту. 11 верасня ён запланаваў правесці аднадзённую агульнарэспубліканскую акцыю, а з 1 кастрычніка заклікаў дробных бізнесоўцаў да бестэрміновага страйку.

Старшыня страйкама Валерый Леванеўскі паведаміў нашаму радыё, што гэтыя планы застаюцца, нягледзячы на ўжо распачатую акцыю: *"Пра які бестэрміновы страйк можна казаць, калі ўсе падаткі ўплочаны. Бестэрміновы страйк можа быць толькі тады, калі падаткі якраз не ўплочаны. Таму я перакананы, што праз колькі дзён людзі на гэтых кірмашах ужо будуць працаваць. У мяне такая думка, што дзяржава стварае паралельную нам структуру, каб перашкаджаць нам. З другога боку, бізнесоўцам гандлёвых выставаў, сапраўды, немагчыма працаваць, таму іх страйк апраўданы."*

Міхаіл СТЭЛЬМАК, беларуская служба Радые Свабода

## Журналісты з "Пагоні" ўладкоўваюцца на новым месцы

Першага верасня асуджаныя нібыта за паклёп на Аляксандра Лукашэнку журналісты гарадзенскай газеты "Пагоня" Мікалай Маркевіч і Павел Мажэйка прыехалі адбываць пакаранне ў прызначаныя спецкамендатуры: Мікола Маркевіч – у Асіповічы, Павел Мажэйка – у Жлобін.

Хуткі цягнік Мінск-Сімферопаль з прычапнымі вагонамі з Гродна прыйшоў у Жлобін апоўдні. Паўла Мажэйку сустракалі на вакзале актывісты мясцовых дэмакратычных суполак – Марат Афанасьеў, Мікалай Пагодзін, Анатоль Мікалаеў. *"Дабраліся выдатна, амаль пусты цягнік. Аказалася, што мы адны як бы з галоўных герояў. Сёння ўсе: і праваднікі, і людзі, што ехалі на Сімферопаль – усе ведаюць пра нашу справу, спачуваюць і жадаюць нам поспехаў"*, – распавядаў Павел.

Начальнік спецкамендатуры Юры Кузьміч прыязна паставіўся да навічка. Нават узрадаваўся, што ў яго ўстанове будзе адукаваны, інтэлігентны чалавек, бо з 90 утрымальнікаў спецкамендатуры большасць – публіка не надта прыстойная. Злодзеі, махляры, хуліганы, аліментшчыкі.

Ужо пасля агледзін гутарым з Паўлам наконт бліжэйшых ягоных месяцаў адбыцця пакарання ў спецкамендатуры: *«Я буду старацца праводзіць сябе так, каб даказваць сваю невінаватасць. Я – нармалёвы законапаслухмяны грамадзянін. Буду спрабаваць знайсці працу паводле сваёй спецыяльнасці. Я – выкладчык гісторыі і журналіст. Спачатку па гэтых спецыяльнасцях буду спрабаваць знайсці працу».*

Галоўны рэдактар газеты "Пагоня" Мікола Маркевіч, які будзе паўтара года ўтрымлівацца ў выпраўленчай установе адкрытага тыпу ў раённым цэнтры Асіповічы у Магілёўскай вобласці, вельмі ўсцешаны тым, што яго сустрэлі і падтрымалі мясцовыя актывісты дэмакратычнага руху, а таксама задаволены пакуль і спакойным стаўленнем да яго міліцыянтаў.

Міколу Маркевіча сустрэлі асіповіцкія дэмакратычныя актывісты: старшыня мясцовага аддзялення Таварыства беларускай мовы Таццяна Брэль і каардынатар раённага інфармацыйнага цэнтра Рыгор Латышэвіч.

Мікола Маркевіч распавёў карэспандэнту «Свабоды» пра свае першыя ўражанні: *"Умовы жыцця проста жудасныя: вонь, брудна і брыдка, тараканы зграямі поўзаюць. Гэта першае ўражанне. Працы няма ніякай. Аднак, дзякаваць Богу, ужо на пероне я адразу меў, што прыехаў усё ж такі ў Беларусь. Мяне сустрэлі вельмі добрыя людзі. Аказваецца, у Асіповічах шмат нашых аднадумцаў. Яны мяне сустрэлі, яны мяне правялі, яны мне ўсё паказалі".*

Мікола ўжо намеціў некалькі ўстаноў, якія будзе наведваць у пошуках працы: *«Першыя "рытуальныя" візіты я планую нанесці ў рэдакцыю газеты "Асіповіцкі край". Бо я – журналіст, з'яўляюся чалавекам дастатковай кваліфікацыі для гэтай прафесіі, і хачу прапанаваць грамадству тое, чым я магу прынесці найбольшую карысць. Як адрэагуе кіраўніцтва гэтых установаў – я, канешне, прагназую. Але проста хачу выканаць нейкія "рытуальныя дзеянні", каб паказаць усю абсурднасць таго, што адбываецца. Каб паказаць, што размова тут не ідзе пра нейкія дзяржаўныя інтарэсы, пра нейкае перавыхаванне Маркевіча. А што размова ідзе проста пра звычайную чалавечую помсту з боку Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі».*

www.svaboda.by

## Новости Республики

### Послеуборочная «чистка»

На основании материалов проверок Комитета госконтроля по Брестской области ряд должностных лиц, отвечавших за уборку зерновых, освобожден от занимаемых должностей и привлечен к дисциплинарной и административной ответственности.

### Министра – в отставку

Белорусская ассоциация журналистов предлагает министру информации Михаилу Подгайному уйти в отставку. В открытом письме к министру подчеркнуто, что его ведомство, наделенное большими полномочиями, превращается в механизм подавления прав и свобод.

### Зарплате за ценами не угнаться

Как сообщает Министерство статистики и анализа, по сравнению с июнем, в рублевом выражении зарплата выросла на 4,4 процента (с 202.818 до 211.670 рублей). В то же время наличный курс доллара повысился на 1,4 процента, а потребительские цены – на 1,2.

### Лицензирование с новыми акцентами

Министерство по налогам и сборам подготовило проект декрета, которым утверждается Положение о государственном регулировании производства, оборота и рекламы алкогольной, непищевой спиртосодержащей продукции, спирта этилового.

### Единый налог: подразнили и отбирают

Правом уплаты единого налога в будущем будут пользоваться далеко не все индивидуальные предприниматели Беларуси. Многим придется работать по той же схеме, что и юридическим лицам, и малым предприятиям. Соответствующий законопроект сейчас разрабатывают в правительстве.

### Минск защищается от российского пива

Ввоз пива в Беларусь скоро станет подакцизным видом деятельности. Официальные источники объясняют введение акцизов необходимостью защиты внутренних производителей. Выдача генеральных лицензий на ввоз пива уже отменена, теперь лицензии будут разовыми. Причем получить их можно только на партию пива объемом не менее 10 тыс. декалитров.

### Минус 100 тысяч работников

По оценке Минстата, численность экономически активного населения на конец июля составила 4,4 млн. человек, или 45% от общей численности населения Беларуси. Из их числа 4,3 млн. человек (97,3%) заняты в экономике. В общей численности населения, занятого в экономике, в первом полугодии 3.659,2 тыс. чел., или 84% составляли работники, работающие на предприятиях и в организациях.

По материалам www.svaboda.by и www.charter 97. org
Отдел информации «С»

Равнодушие

# Дети стоят в очереди за родителями


**Несколько дней назад в редакцию позвонила взволнованная женщина. Она рассказала о том, что ее коллега недавно родила и не хочет забирать ребенка из роддома.**

По словам звонившей, Валентина и Виктор жили в гражданском браке уже несколько лет, когда женщина забеременела. Ребенка хотели оба родителя, но идти в ЗАГС Виктор не спешил, так как уже один раз ошибся в выборе спутницы жизни. Вскоре Валентина родила и... оставила ребенка в роддоме. Оказывается, тридцатилетнюю дочь, которая к тому же зарабатывает больше двухсот тысяч рублей в месяц, запугала родная мать, сказав, что прогонит ее из дома, если та заберет малыша. *«А вдруг он тебя бросит с ребенком? Я тебя домой не пущу!»* – угрожала мамаша. И дочь, испугавшись, забыла свой материнский долг. Так, выясняя свои отношения, взрослые люди, походя, исковеркали жизнь ребенка. «*Помогите повлиять на них*, – просила знакомая Валентины, – *напишите статью, может, одумаются, возьмут ребеночка, ведь он здоровенький, хорошенький такой. За что же ему такая жестокая судьба?»*

*«Это не судьба жестока, а люди, – говорит Галина Короткевич, заведующая отделением новорожденных №1 г. Барановичи. – Да и социальная неустроенность семей играет не последнюю роль. Раньше, когда у людей была работа, возможность получить жилье, отказов было меньше».*

Одна горе-мамаша просто убежала из роддома, и ее до сих пор ищет милиция, а ребенок передан в детскую больницу. Вторая уложила малютку в корзинку и оставила в поезде как бездомного котенка. Из роддома малыши попадают в детскую больницу, где многие из них будут расти почти до года. Потом – Пинский дом ребенка. Конечно, их будут кормить и одевать, учить ходить и разговаривать. Их даже будут любить. Но большинство из них никогда не произнесет слово «мама», не узнает ласки материнских рук и суровой мужской любви отца. Теперь они – дети-отказники, потом – дети-сироты. Судьбу ребят определили их родные матери.

Кто они – те женщины, которые так хладнокровно смогли выбросить из своей жизни этот теплый, доверчивый, беззащитный комочек – свое новорожденное дитя? *«Раньше в основном это были молоденькие матери-одиночки*, – рассказывает Галина Короткевич. – *Некоторые из них оформляли временный отказ на год или два, чтобы, устроившись в жизни получше, забрать ребенка. Сейчас же нередко оставляют детей в роддоме семейные женщины, у которых это третий или четвертый ребенок».* Так, по словам заведующей, из четырех «отказниц» у трех это были третьи или четвертые роды.


Фото Евгения Янукевич

• А может, ты моя мамочка?

Матери мотивируют отказ поразному, но чаще всего свой поступок объясняют тем, что дальше с мужем жить не собираются, так как он пьяница, а одной ребенка вырастить трудно. А есть и такие, которые даже на трудности не изволят пожаловаться. Оставляя ребенка в роддоме, они сообщают, что просто передумали его растить и портить себе жизнь.

По-прежнему часто оставляют детей в роддоме несовершеннолетние матери и молодые матери-одиночки. Правда, иногда в таких случаях малыша забирают бабушки и дедушки. Иначе, по мнению работников роддома, брошенных детей было бы гораздо больше.

Конечно, некоторым из них везет – их усыновляют. Правда, если раньше родители стояли в очереди за детьми, теперь ситуация кардинально изменилась. Как пояснила нам специалист отдела охраны детства Лариса Разумович, сейчас очереди на усыновление нет. Детей более чем достаточно, даже можно выбирать. Другими словами, сейчас дети стоят в очереди за родителями.

Галина ЗАГАДСКАЯ

По следам публикаций

# Из дому в приют для сирот

**Третьего сентября из нашего района в школу-интернат для детей-сирот, что находится в д. Бытень Ивацевичского района, увезли четверо детей, где они теперь будут жить и учиться. В их числе и Катя Жарковская, о которой мы писали в № 29 нашей газеты.**

Следуя просьбам наших многих читателей, мы решили сообщить о дальнейшей судьбе девочки.

